# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

22 красавіка 2004 года, чацвер, № 6 (1891)


ВЕДАЙ НАШЫХ!

## Прага прынесла залатыя медалі праграмістам БДУ



Каманда БДУ ў складзе студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі капітана Вікторыі Лебедзь, Івана Мяцельскага і Максіма Восіпава (трэнер Уладзімір Міхайлавіч Котаў, загадчык кафедры дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі ФПМІ БДУ, кіраўнік Людміла Уладзіміраўна Пеўзнер, дацэнт, дырэктар Заходняга рэгіёну) заваявала залатыя медалі на фінальных спаборніцтвах каманднага чэмпіянату свету па праграміраванні сярод студэнтаў, якія праходзілі ў сталіцы Чэхіі горадзе Празе. На іх ліку шэсць вырашаных задач. Такім чынам, беларуская каманда, заваяваўшы залатыя медалі і заняўшы трэцяе месца, абагнала ўсе каманды ЗША: Масачусетскага тэхналагічнага інстытута (5-е месца), Каліфарнійскага тэхналагічнага інстытута (7-е месца), Гарвардскага універсітэта (9-е месца) і Стэндфардскага універсітэта (13-е месца). Ззаду засталася і каманда-пераможца мінулагодніх фінальных АСМ-спаборніцтваў у Лос-Анжэлесе: студэнты Варшаўскага універсітэта на гэты раз аказаліся на 10-м месцы. Каманда Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта (другое месца на спаборніцтвах 2003 года) змагла рашыць толькі адну задачу і не ўвайшла ў лік класіфікаваных каманд.

Трэба адзначыць, што за шэсць гадоў існавання Заходняга чвэрцьфінальнага рэгіёну чэмпіянату свету па праграміраванні сярод студэнтаў, які быў створаны ў 1998 годзе на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта, каманды БДУ ўжо ў пяты раз трапляюць на фінальныя спаборніцтвы, якія ладзіць міжнародная арганізацыя АСМ — вельмі аўтарытэтная ў свеце камп'ютараў. Такое яшчэ не ўдавалася зрабіць аніводнай камандзе Беларусі і краін Балтыі. Студэнты БДУ ўжо пабывалі на фінальных спаборніцтвах у Нідэрландах, Канадзе і тройчы ў ЗША.

На фінале ў Празе ім прыйшлося ўступіць у барацьбу з 73 мацнейшымі камандамі з розных краін свету. І хоць першае месца занялі студэнты Санкт-Пецярбургскага інстытута дакладнай механікі і оптыкі, а другое — студэнты Шведскага каралеўскага тэхналагічнага інстытута, беларусы ўвайшлі ў першую чацвёрку, якая была адзначана залатымі медалямі.

*Ганна ЛАГУН*
*Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

КОНКУРСЫ

## Першыя крокі ў навуку

Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў, аспірантаў і магістрантаў па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках за 2003 г. адбылася 16 красавіка ў зале пасяджэнняў вучонага савета нашага універсітэта. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства адукацыі на чале з міністрам А.М. Радзьковым, кіраўніцтва БДУ, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Вышэйшай атэстацыяйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

Арганізатарам конкурсу выступіла Міністэрства адукацыі, якое заснавала 62 прэміі для найлепшых работ. Дзве прэміі — спецыяльныя, прымеркаваныя да 10-годдзя прыняцця Канстытуцыі Беларусі.

На конкурс паступіла 1471 работа студэнтаў з 52 ВНУ. 39 чалавек падрыхтавалі па 2 работы, 1 — тры і яшчэ 1 — чатыры. Вялікая колькасць работ была з БДУ (85). Тройку першынства трымалі БДУІР (122 работы), Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава (105) і БДТУ (104).

Найбольшую колькасць работ разгледзелі наступныя камісіі: машынабудаванне, станкабудаванне, металургія і апрацоўка матэрыялаў, рэсурсазберагальныя тэхналогіі, аўтаматызацыя вытворчых працэсаў па галінах народнай гаспадаркі, у т.л. харчовая прамысловасць, — 71, інфарматыка, інфармацыйныя тэхналогіі, інфармацыйнае забеспячэнне адукацыі, інфармацыйная бяспека — 81, педагогіка, тэорыя і методыка выкладання асобных дысцыплін — 88, эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве, менеджмент і кіраванне турыстычным бізнесам — 120, медыцынскія і фармацэўтычныя навукі — 185.

Пераможцы і лаўрэаты конкурсу атрымалі граматы і грашовыя ўзнагароды. Іх работы ўбачаць свет у спецыяльна падрыхтаваным да публікацыі зборніку.

*Па інфармацыі прэс-службы БДУ падрыхтавала Сняжана ЛІСОЎСКАЯ*

ТЭХНАЛОГІІ

## Праграмны прадукт студэнтаў высока ацэнены

Студэнты БДУ занялі другое месца на конкурсе, які ў сакавіку праводзіла кампанія **Microsoft** на факультэце тэхнічнай кібернетыкі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага політэхнічнага універсітэта. Студэнты IV курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Аляксей Качанаў, Канстанцін Чарныш і Таццяна Какарэка прадставілі ў рамках секцыі "Праграмныя прадукты і сістэмы" сваю версію сістэмы электроннага гандлю **iStore**, а таксама пакет дакументацыі, неабходны для яе апісання і суправаджэння. Гэта сістэма электроннага гандлю першапачаткова распрацоўвалася як прамысловы праект на базе універсітэцкай лабараторыі "Інфармацыйныя тэхналогіі" (bsu.iba.by) па заказе сумеснага беларуска-амерыканскага прадпрыемства IBA.

У конкурсе "Тэхналогіі Microsoft у тэорыі і практыцы праграміравання" ўдзельнічала больш за 130 праектаў студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных з вядучых ВНУ і арганізацый Паўночна-заходняга рэгіёну Расіі, а таксама з Украіны і Беларусі. Аднак менавіта праект беларусаў заняў другое месца па выніках конкурсу. А каманда студэнтаў з Беларускага дзяржаўнага універсітэта была ўзнагароджана дыпломамі і прызамі: ліцэнзійнымі пакетамі праграмнага забеспячэння "Visual Studio. NET Academic Edition" і Windows XP ад кампаніі Microsoft. І самае галоўнае, што БДУ і кампанія **Microsoft** дамовіліся аб распрацоўцы сумесных адукацыйных праграм, вучэбных курсаў па праектаванні і праграміраванні складаных сістэм.

*Ганна ЛАГУН*

АБ'ЯВЫ

## Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** агульнай фізікі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, дыферэнцыяльных ураўненняў, лікавых метадаў і праграміравання, функцыянальнага аналізу, тэарэтычнай і прыкладной механікі, фізіялогіі чалавека і жывёл, сацыялогіі, філасофіі культуры;

**ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ:** вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, лазернай фізікі і спектраскапіі, вышэйшай алгебры, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, аналітычнай хіміі, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, сацыялогіі журналістыкі, міжнароднага турызму;

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ**: вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі, агульнай фізікі, энергафізікі, вышэйшай матэматыкі, матэматычнага мадэліравання і аналізу даных, матэматычнай фізікі, метадаў аптымальнага кіравання, тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі, фізічнай электронікі, сістэмнага аналізу, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, тэорыі функцый, функцыянальнага аналізу, лікавых метадаў і праграміравання, аналітычнай хіміі, арганічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, фармацыі, неарганічнай хіміі, геадэзіі і картаграфіі, малекулярнай біялогіі, генетыкі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, сучаснай беларускай мовы, міжнародных эканамічных адносін, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, сацыяльнай камунікацыі, філасофіі і метадалогіі навукі, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, банкаўскай і фінансавай эканомікі, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, міжнароднага турызму, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, сацыялогіі;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** фізікі цвёрдага цела, лазернай фізікі і спектраскапіі, геадэзіі і картаграфіі, сучаснай беларускай мовы, раманскага мовазнаўства, медыка-біялагічных тэхналогій, літаратурна-мастацкай крытыкі, псіхалогіі, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, крыніцазнаўства, нямецкай мовы, міжнароднага турызму, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў;

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** беларускай літаратуры XX стагоддзя, гісторыі беларускай мовы, раманскага мовазнаўства, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, літаратурна-мастацкай крытыкі, тэлебачання і радыёвяшчання, гісторыі новага і найноўшага часу, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, нямецкай мовы, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, менеджменту, эканамічнай тэорыі, усходніх моў, раманскіх моў;

**АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, кібернетыкі, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, аналітычнай хіміі, заалогіі, мікрабіялогіі.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Белдзяржуніверсітэт, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
22 красавіка 2004 года, чацвер, № 6 (1891)

А Ў НАС І А Ў ВАС?

# Сандружына геафака на вучэннях

15 красавіка 2004 года ў адпаведнасці з распараджэннем кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна ў БДУ праводзіліся спаборніцтвы паміж звёнамі санітарнай дружыны геаграфічнага факультэта. Галоўная мэта мерапрыемства — удасканаленне тэарэтычных ведаў і замацаванне практычных навыкаў дзеянняў сандружыны ў надзвычайных сітуацыях.

У судзейскую калегію спаборніцтва ўвайшлі прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях В.В. Сувораў, начальнік штаба грамадзянскай абароны С.С. Пірожнік, намеснік дэкана геаграфічнага факультэта М.В. Кухарчык, старшы выкладчык кафедры медыцынскіх біялагічных тэхналогій Л.В. Чыж і камандзір сандружыны Д. Л. Тварановіч.

скай дапамогі пацярпелым у час аварый, катастроф і стыхійных бедстваў, навыкі па ахове насельніцтва ў надзвычайных сітуацыях, іх папярэджанні і ліквідацыі.

Па выніках мерапрыемства, падведзеных судзейскай калегіяй, найлепш падрыхтаваным да спаборніцтва аказалася пятае звяно сандружыны (камандзір І. Мядзведзеў), якое з невялікім адрывам ад астатніх набрала 45 балаў. Увогуле, праведзеныя







Санітарная дружына геаграфічнага факультэта на чале з яе камандзірам, асістэнтам кафедры дынамічнай геалогіі Д.Л. Тварановічам паспела добра сябе зарэкамендаваць яшчэ ў кастрычніку, падчас правядзення ў нашым універсітэце комплекснага вучэння па грамадзянскай абароне: яна паказала найлепшыя вынікі пры выкананні практычных мерапрыемстваў па ахове супрацоўнікаў і студэнтаў пры пагрозе і ўзнікненні надзвычайных сітуацый.

Спаборніцтва праходзіла ў пяць этапаў, падчас якіх суддзям належала ацаніць узровень страявой падрыхтоўкі звёнаў сандружыны, яе аснашчэнне, уменне карыстацца табельнай амуніцыяй, аказваць першую медыцынскую дапамогу пацярпелым пры траўмах у ачагу вытворчай аварыі і пры паражэнні моцнадзейнымі атрутнымі рэчывамі (аміякам, хлорам, ртуццю). У тэарэтычным конкурсе камандзіры звёнаў прадэманстравалі свае веды па аказанні медыцын-

спаборніцтвы паказалі належны ўзровень падрыхтоўкі сандружыны, яе гатоўнасць наладжана і эфектыўна дзейнічаць падчас надзвычайных сітуацый. На спаборніцтвах прысутнічалі таксама камандзіры санітарных дружын біялагічнага і філалагічнага факультэтаў. Сёлета яны будуць удзельнічаць у падобных мерапрыемствах, таму ў іх была добрая магчымасць набыць неабходны вопыт.

*Сняжана ЛІСОЎСКАЯ*

*Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

## БДУ вітае вясёлых і знаходлівых

26 сакавіка ў актавай зале філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта адбыўся дзесяты юбілейны фестываль Клуба вясёлых і знаходлівых. У гэтым мерапрыемстве прымалі ўдзел пятнаццаць камандаў з розных ВНУ. Ацэньвала выступы камандаў журы ў складзе капітана каманды КВЗ БДУ Аляксандра Гаўрыльчыка і рэдактараў Сяргея Турбана, Віктара Толкача.

У 1/8 фінала трапіла дзесяць камандаў: "По модулю"(эканамічны факультэт БДУ), "Шутки ради" (юрыдычны факультэт БДУ), "Разные люди" (БДПУ), "Закройте дверь", "Проездной билет" (механіка-матэматычны факультэт БДУ), "Какая разница"(факультэт менеджмента нерухомай маёмасці),"VIP" (Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт), "Геофак", "Баракуда"(БДТУ), "9 и S".

Арганізатарам мерапрыемства ўжо некалькі гадоў запар з'яўляецца Упраўленне па справах культуры Белдзяржуніверсітэта сумесна з капітанам каманды КВЗ БДУ Аляксандрам Гаўрыльчыкам. Ён жа быў вядучым гэтай сустрэчы.

Наступны турнір пройдзе 13—14 мая ў актавай зале філалагічнага факультэта БДУ.

*Лідзія СЕМЯНКОВА,*
*студэнтка І курса факультэта журналістыкі*

## Ад сесіі да сесіі...

У Дзень гумару, 1 красавіка Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ наладзіла выдатнае свята для навучэнцаў універсітэта.

Рыхтавацца да свята пачалі загадзя: усім факультэтам прапанавалі намаляваць гумарыстычны плакат, карыкатуру ці шарж. Конкурс паказаў нямала мастацкіх і літаратурных экзэрсісаў, якія з усмешкай выяўляюць студэнцкае жыццё. Найлепшыя працы (студэнтаў юрыдычнага і механіка-матэматычнага факультэта) і дагэтуль можна ўбачыць у кабінеце студэнцкага прафкама БДУ.

А 1 красавіка ў дыскаклубе "Ваўчок" ("Юла") адбылося шоу, арганізатарам якога стаў таксама прафкам студэнтаў. Каманды КВЗ юрыдычнага, філалагічнага і эканамічнага факультэтаў павесялілі гледачоў запамінальнымі выступамі і вострымі жартамі. Асабліва бліскуча глядзелася каманда эканамічнага факультэта — дасціпная і з выдатнымі пародыямі. У гэты ж дзень адбыліся выступы майстроў брэйк-дансу і шматлікія конкурсы. Скончыўся вечар дыскатэкай, якая пад агульныя жарты і весялосць зацягнулася пасля паўночы.

*Лілія САВІЦКАЯ*

## Памяць сэрца

З ініцыятывы Саюза жанчын БДУ 8 красавіка на юрыдычным факультэце прайшоў традыцыйны агульнауніверсітэцкі фестываль бардаўскай песні "Памяць сэрца", прысвечаны сёлета 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У фестывалі прынялі ўдзел 20 бардаў з амаль усіх факультэтаў БДУ — як пачаткоўцы, так і пераможцы разнастайных конкурсаў. Студэнты II курса аддзялення эканамічнага права падрыхтавалі літаратурна-музычную кампазіцыю "З чаго пачынаецца Радзіма..." Гучалі вершы як уласнага сачынення, так і вядомых беларускіх і рускіх паэтаў, якія паказвалі любоў да роднага краю. Вершы дапаўняліся песнямі ў выкананні Ганны Хвашчынскай — студэнткі II курса.

Шмат было сказана не толькі пра вайну, але і пра нашу Беларусь. У тэатральнай інсцэніроўцы, падрыхтаванай студэнткамі-другакурсніцамі А.Ціханскай і А.Шуцько, былі паказаныя найлепшыя рысы нацыянальнага характару — гасціннасць і шырыня душы беларускага народа. Апрача вершаў, студэнты частавалі гасцей караваем, які вынеслі на вышытым ручніку.

Усе пераможцы атрымалі ўзнагароды ад Саюза жанчын БДУ і грашовыя прэміі дэканата.

*В. С. БРАНАВЕЦ,*
*старшыня Саюза жанчын юрыдычнага факультэта,*
*член Савета Саюза жанчын*

## Праблемы педагогікі

З ініцыятывы нашага універсітэта на базе кафедры педагогікі 15 красавіка прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Якасць вышэйшай педагагічнай адукацыі: праблемы і шляхі павышэння". Асноўнымі задачамі канферэнцыі, паводле словаў загадчыцы кафедры педагогікі В.Л. Жук, былі вызначаныя паказ і абмеркаванне вынікаў навукова-педагагічных даследаванняў па наступных праблемах: філасофска-метадалагічныя асновы развіцця педагагічнай адукацыі, педагагічная адукацыя ў кантэксце дзвюхступеннай падрыхтоўкі выпускнікоў, праектаванне і рэалізацыя зместу і тэхналогій выкладання псіхолага-педагагічных дысцыплін у ВНУ, новыя падыходы да распрацоўкі навучальна-метадычнага забеспячэння педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў і інш.

Удзел у працы канферэнцыі ўзялі рэктар БДУ, прафесар В.І. Стражаў, першы намеснік міністра адукацыі, прафесар А.І. Жук, загадчыца кафедры тэорыі выхавання Сафійскага універсітэта Св. Клімента Ахрыдскага Э.Рангелава (Балгарыя), супрацоўнікі ВНУ з Беларусі, Балгарыі, Латвіі, Літвы, Расіі, Украіны.

*Алена КУРХІНЕН*

АСОБЫ

# Слова ў кантэксце Часу

**На кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта 10 сакавіка 2004 г. прайшлі Рэспубліканскія навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці і 75-годдзю з дня нараджэння доктара філалагічных навук, прафесара Аркадзя Іосіфавіча Наркевіча.**



ЯГО светлае імя засталося ў памяці тых, хто працаваў з ім, вучыўся ў яго, адкрываў разам з ім залатыя скарбонкі роднай мовы — выкладчыкаў, студэнтаў-журналістаў, многіх-многіх людзей. А яшчэ — у яго шматлікіх кнігах і працах, прысвечаных роднай беларускай мове.

Пра ўсё гэта цёпла і пранікнёна гаварылі на адкрыцці чытанняў дэкан факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта дацэнт В.П. Вараб'ёў, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання БДУ дацэнт В.І. Іўчанкаў, супрацоўнікі факультэта журналістыкі — прафесар М.Я. Цікоцкі, дацэнты Л.П. Белякова, У.К. Касько, загадчык кафедры беларускага моваразнаўства БДПУ імя М. Танка дацэнт П.А. Міхайлаў, жонка прафесара А.І. Наркевіча Ніна Іванаўна, яго дачка Таццяна Аркадзьеўна і інш.

Ушанаваць памяць педагога, настаўніка, вучонага, слыннага знаўцы роднай мовы прыехалі навукоўцы з розных вышэйшых навучальных устаноў Віцебска, Гомеля, Мазыра... Іх выступленні былі прасякнуты шчырай удзячнасцю прафесару А.І. Наркевічу за той вялікі ўклад у развіццё беларускага мовазнаўства, за тое, што родная мова жыве, красуецца і будзе жыць.

У чытальнай зале бібліятэкі факультэта журналістыкі была разгорнута выстава, прысвечаная жыццю і творчай дзейнасці А.І. Наркевіча.

Вядомы вучоны Аркадзь Іосіфавіч Наркевіч нарадзіўся 10 сакавіка 1929 г. у вёсцы Вараноўшчына Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут (1951 г.). Працаваў у школе, а пасля заканчэння аспірантуры (1955 г.) — у Інстытуце мовазнаўства АН БССР на пасадзе малодшага, затым старшага навуковага супрацоўніка. З 1965 года А.І. Наркевіч працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце, дзе займаў пасаду дацэнта кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання факультэта журналістыкі. З 1976 года — прафесар, а з 1989 — загадчык гэтай кафедры. Доктар філалагічных навук (1974 г.).

Галоўнымі аб'ектамі навуковых даследаванняў А.І. Наркевіча з'яўляліся марфалогія і сінтаксіс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Кандыдацкую дысертацыю на тэму «Спосабы выражэння азначэнняў у сучаснай беларускай мове» ён абараніў у 1956 г., доктарскую на тэму «Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай літаратурнай мове: структурна-семантычнае апісанне» — у 1973 годзе.

У манаграфіі «Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове» (1972 г.) на багатым фактычным матэрыяле А.І. Наркевіч прааналізаваў уласцівыя беларускай літаратурнай мове словазлучэнні з боку іх структуры, семантыкі і стылістычнай прыналежнасці, вызначыў агульныя тэндэнцыі і кірункі развіцця самой іх сістэмы.

Манаграфія А.І. Наркевіча «Назоўнік: Граматычныя катэгорыі і формы» (1976 г.) вызначаецца багаццем фактычнага матэрыялу і глыбокім аналізам яго граматычнага і стылістычнага боку.

А.І. Наркевіч з'яўляецца сааўтарам акадэмічных прац «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Сінтаксіс» (1959 г.) і «Граматыка беларускай мовы» (т. 1—2, 1962—1966 гг.).

Амаль сорак гадоў прафесар А.І. Наркевіч аддаў Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту. Працуючы на пасадзе загадчыка кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, адчуваў і актыўна падтрымліваў новыя павевы ў лінгвістыцы, філалогіі, адкрываў іх новыя гарызонты.

Так, у навучальны план факультэта журналістыкі былі ўключаны курсы «Слова ў кантэксце часу», «Лінгвістыка публіцыстычнага тэксту», «Рыторыка», «Моўная норма: сістэмнасць і асістэмнасць» і інш. Для студэнтаў дзённага і завочнага аддзяленняў А.І. Наркевіч выдаў арыгінальны навучальны дапаможнік для самастойнай работы «Практычны курс сучаснай беларускай мовы» (1992 г.). Ён клапаціўся пра студэнта, запрашаў да роздуму, разваг, вучыў любіць, паважаць роднае слова.

75-гадовы юбілей доктара філалагічных навук, прафесара, члена Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь, выдатніка адукацыі А.І. Наркевіча яскрава акрэслівае набыткі беларускага мовазнаўства, школы айчыннай журналістыкі, веліч і моц беларускай мовы.

І тут хочацца нагадаць словы, якія сказаў у час чытанняў загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, дацэнт факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта В. І. Іўчанкаў:

— У беларускага народа ёсць прыгожае слова «знічка», якое перадае імгненнае адчуванне вечнасці. Так у народзе называюць зорку, што акрэслівае сабою неба і, не далятаючы да зямлі, гасне. Але тое імгненне яе зорнага існавання надоўга застаецца ў людской памяці, пакідае выразны адбітак, сваю непаўторную выяву, якімі жывыя цешацца...

Гэта пра Аркадзя Іосіфавіча.

*Леанід КЛЫШКО*

АБ'ЯВЫ

## Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:

прафесара кафедры сацыяльнай работы (1 чалавек).

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.

## Нацыянальны навукова-вучэбны цэнтр фізікі часціц і высокіх энергій БДУ (НЦ ФЧВЭ БДУ) аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:

— загадчыка лабараторыі фізікі часціц (1 чалавек);

— малодшага навуковага супрацоўніка ў лабараторыю фундаментальных узаемадзеянняў (2 чалавекі);

— малодшага навуковага супрацоўніка ў лабараторыю квантавай тэорыі поля (1 чалавек).

Тэрмін падачы дакументаў — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220040, г. Мінск, вул. М. Багдановіча, 153, пакой 302, тэл. 203-60-34, аддзел кадраў (А.П. Несцяровіч).

## Вучэбна-адукацыйная ўстанова БДУ "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы" запрашае на курсы павышэння кваліфікацыі ў красавіку—чэрвені 2004 г. выкладчыкаў і супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта

1. Цэнтралізаванае тэсціраванне і адзіны экзамен у Рэспубліцы Беларусь: вопыт, праблемы і шляхі рашэння (для выкладчыкаў ВНУ) — вочная (26.04—30.04);
2. Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў забеспячэнні і выкладанні прыродазнаўчых дысцыплін (для выкладчыкаў ВНУ) — вочна-завочная (26.04—30.04, 14.06—19.06);
3. Распрацоўка электронных матэрыялаў для дыстанцыйнага навучання (для прафесарска-выкладчыцкага складу ВНУ, сістэмы ПК) — вочная (26.04—08.05);
4. Беларуская эканамічная мадэль — кампанент ідэалогіі беларускай дзяржавы (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочная (17.05—29.05);
5. Выкладанне філасофска-культуралагічных дысцыплін ва ўмовах дзвюхступеннай сістэмы адукацыі (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочная (17.05—22.05);
6. Праектаванне і распрацоўка мадэляў кіруемай самастойнай работы студэнтаў (для выкладчыкаў ВНУ) — вочна-завочная (24.05-29.05);
7. Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі распрацоўкі электронных вучэбных матэрыялаў (для прафесарска-выкладчыцкага складу і вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ, сістэмы ПК) — вочная (24.05-05.06).

Калі Вас зацікавіла наша інфармацыя і Вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па №№ 222-83-03, 220-20-47 для папярэдняга запісу ў групы.

Наш адрас: г.Мінск, вул. Маскоўская, 15, "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ", каб. 320, тэл. 222-83-03, 220-20-47, тэл./факс 220-25-51.

У НАС У ГАСЦЯХ

# Сустрэча з Народным мастаком

**Адбылася сустрэча студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта з народным мастаком Беларусі Васілём Шаранговічам. Сустрэчу арганізавала фундаментальная бібліятэка БДУ.**

В. Шаранговіч вядомы як кніжны ілюстратар: ён робіць кнігі больш яркімі, цікавымі, выразнымі. Ён праілюстраваў больш за 60 кніг — "Новая зямля" Якуба Коласа, "Пан Тадэвуш" Адама Міцкевіча, вершы Янкі Купалы і інш. Апрача таго, В. Шаранговіч вядомы і як майстар станковага жывапісу. Яго працы: партрэты, пейзажы, кампазіцыі — прынеслі яму вядомасць і прызнанне не толькі ў Беларусі, але і па-за яе межамі. Карціны мастака выстаўляліся ў Польшчы, Італіі, Францыі, Даніі, Канадзе, Фінляндыі, Індыі, Сірыі, Германіі.

Сам В. Шаранговіч хоча напісаць кнігу — асэнсаваць час, у якім пражыў ён сам, яго бацькі. Плануе напісаць партрэты сваіх вядомых сяброў — Рыгора Барадуліна, Васіля Быкава, Максіма Танка...

На сустрэчы гучала мноства пытанняў:

— Адкуль вы чэрпалі вобразы для ілюстравання "Новай зямлі"?

— Гэта вобразы: простыя мужыкі-сяляне, беларусы, — сярод якіх я вырас. Я не паказваю іх прыгнечанымі, прыніжанымі — яны людзі, якія годна жывуць у сваім часе. Але з таго часу шмат што змянілася. Нядаўна я праехаў па сваіх родных мясцінах — Мядзел, Паставы, Гродзенская вобласць: няма моладзі, людзі страцілі або не памятаюць свае звычаі, абрады. І гэта вельмі цяжка бачыць. Я ведаю, што перад людзьмі, з якіх я пісаў свае вобразы, свой доўг я выканаў — доўг мастака, чалавека, патрыёта Беларусі. І я заўсёды кажу сваім студэнтам: калі мастак абапіраецца на вытокі сваёй зямлі, а не капіруе каго-небудзь, ён заўсёды будзе адметным.

— Як вы выхоўваеце сваіх студэнтаў у Беларускай акадэміі мастацтваў?

— Заўсёды кажу ім, што я даю толькі асновы мастацтва — фундамент, а сам студэнт потым будуе дом. І які гэта будзе дом, ці спадабаецца ён людзям — усё залежыць ад мастака.

— Вашая ўнучка таксама піша?

— Так, нядаўна ў нас прайшла сумесная выстава. Яна вельмі добра піша. Калісьці я марыў, каб сын быў мастаком, але ён не пажадаў: скончыў радыётэхнічны універсітэт, вывучыўся на праграміста, і яго запрасіў да сябе Біл Гейтс. Але я не шкадую, што ён не здзейсніў маю мару: чалавек павінен рабіць тое, што хоча і ўмее, — таленавіта і прафесійна.

*Падрыхтавала Алена КУРХІНЕН*

ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

# Новыя кнігі для студэнтаў і выкладчыкаў

**Для забеспячэння вучэбнага працэсу і навукова-даследчай работы універсітэта ў першым квартале бягучага года выдадзена 69 кніг і брашур агульным аб'ёмам 558,47 улікова-выдавецкіх аркушаў. З іх 57 вучэбных і 11 навуковых кніг. Асабліва добра спрацавалі факультэты міжнародных адносін, філалагічны, біялагічны, журналістыкі, філасофіі і сацыяльных навук, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі.**




**Михалькевич Г. Н. Протокол и этикет международного общения.** Вучэбны дапаможнік з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь разглядае прынятыя ў міжнародных зносінах правілы пратакола і этыкету.




**Зубкевич Г. И. Систематика высших растений. Голосеменные.** Выданне, дапушчанае Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка, прызначаецца студэнтам біялагічных спецыяльнасцей.

**Слука А.Г. Беларуская журналістыка. Ч. 2.** На аснове аналізу гістарычнага матэрыялу ў вучэбным дапаможніку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адлюстроўваецца развіццё беларускай журналістыкі з 1917 па 1941 г.

**Вашкевич В.Р., Шибут И.П. Новейшие коммуникационные технологии.** У вучэбна-метадычным комплексе асвятляюцца пытанні развіцця масавай камунікацыі ў постындустрыяльных краінах і Беларусі, уплыў тэхналогій камунікацыі на развіццё чалавечага грамадства.

**Зверович Э.И. Вещественный и комплексный анализ. Ч. 1. Введение в анализ и дифференциальное исчисление.** Гэты вучэбны дапаможнік, дапушчаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, — толькі першая частка сучаснага курса рэчавага і комплекснага аналізу.

**Бригадина О.В. "Три волны" российской советской эмиграции (1917—1991 гг.).** У вучэбна-метадычны комплекс апрача праграмы, лекцыйных матэрыялаў і практыкуму па спецкурсе ўвайшлі таксама фрагменты арыгінальных тэкстаў, якія ілюструюць тэму.

**Руденко А.А. Современный русский язык. Ч. 2.** У вучэбна-метадычным комплексе вялікая ўвага надаецца развіццю ўяўленняў пра механізмы рускай арфаграфіі, пунктуацыі, формаўжывання.




**Демидчик В.И. Элементы теории колебаний.** У вучэбным дапаможніку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь разглядаюцца агульныя ўласцівасці вагальных працэсаў, якія адбываюцца ў разнастайных дынамічных сістэмах.

**Зельскі А.Г. Першая Пантыйская (Мітрыдатава) вайна.** У манаграфіі даследуецца праблема супрацьстаяння Пантыйскага царства і Рыма. Пададзены картаграфічныя і схематычны матэрыял, храналогія.

**Рагойша А.А. Поиск химической информации в Интернете. Поисковые системы и тематические каталоги.** У дапаможніку даюцца прынцыпы правядзення інфармацыйнага пошуку ў тэкставых электронных базах даных.

**Решетников Д.Г. Международный туризм в системе внешней торговли Беларуси.** У навучальным дапаможніку разглядаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця міжнароднага турызму ў сістэме знешнегандлёвай дзейнасці Беларусі.

**Задачи по общей физике.** Выданне змяшчае больш за 350 задач і якасных пытанняў, а таксама варыянты кантрольных работ рознага ўзроўню складанасці па ўсіх асноўных раздзелах курса агульнай фізікі.

*Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы*

СПОРТ

# Студэнт? На пляцоўку!

Вы лічыце, што ў баскетбол гуляюць толькі двухметровыя спартсмены? Вы лічыце, што сапраўдную гульню можна ўбачыць толькі ў NBA? Спяшаюся вас упэўніць, што гэта не так. На філалагічным факультэце БДУ баскетбол — найбольш папулярны від спорту. І прыклад студэнтам падаюць самі выкладчыкі.

Раз на год праходзяць паказальныя шоу-матчы, прысвечаныя Дню гумару. Кіраўніцтва факультэтам і кафедрай рускай мовы не перашкаджае прафесару Івану Сямёнавічу Роўду быць бясстрашным капітанам каманды выкладчыкаў. Узначаленыя ім дацэнты, прафесары і выкладчыкі выходзяць супраць студэнтаў. Намеснік дэкана Сяргей Аляксандравіч Важнік выконвае ролю камісара каманды. Яшчэ ў студэнцкія гады ён захапіўся гульнёй, а паглядзеўшы на Барыса Юстынавіча Нормана (вельмі аўтарытэтнага прафесара не толькі мовы, але і баскетбола), сам пачаў выходзіць на пляцоўку.

У перапынках паміж матчамі маляўнічае відовішча прадстаўляюць танцавальныя гурты. З кожным годам паглядзець на гульню прыходзіць усё больш і больш балельшчыкаў. Гледачы ўжо ледзь змяшчаюцца ў зале.

Выкладчыкі кажуць, што гульня мае найперш выхаваўчыя мэты. Аднойчы ўбачыўшы гэткую вырашальную сустрэчу, студэнт марыць пераўзысці свайго выкладчыка не толькі ў навуковай дзейнасці, але і быць не горшым на пляцоўцы. Выкладчык жа, добра паказаўшы сябе на пляцоўцы, можа ўжо не клапаціцца пра сваю папулярнасць. Дзе яшчэ можна ўбачыць захапляльны прарыў дацэнта з мячом? На якой канферэнцыі прафесар можа здабыць такія воплескі?

Калі хочаце збіць з ног дэкана факультэта, прыходзьце!

*Надзея ГАЦЯЛЮК*

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Кінь курыць і выйграй!

У маі 2004 г. адбудзецца VI Міжнародная антытабачная кампанія "Кінь курыць і выйграй — 2004". Яна пройдзе ва ўсім свеце.

Паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ), ад хваробаў, звязаных з курэннем, штогод у свеце памірае 5 млн чалавек, у Беларусі — каля 16 тыс. чалавек. Калі не прыняць меры, дык праз 25 гадоў гэтыя лічбы ўзрастуць у 2,5 раза. Міжнародныя антытабачныя кампаніі, якія праводзяцца раз у два гады, з'яўляюцца адной з формаў барацьбы з курэннем. У кампаніі 2002 г. у Беларусі прынялі ўдзел больш за 8000 чалавек, з іх амаль 2500 толькі ў Мінску.

Мы запрашаем усіх жыхароў Мінска ва ўзросце ад 18 гадоў, якія маюць стаж пастаяннага курэння не менш за год, прыняць удзел у сёлетняй міжнароднай антытабачнай кампаніі. Для ўдзелу трэба запоўніць друкаванымі літарамі рэгістрацыйную картку і адправіць яе па пошце ці прывезці асабіста не пазней за 2 мая на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Я. Купалы, 9, Мінскі гарадскі цэнтр здароўя (праезд аўтобусам № 100 да цырка, трамваямі 1, 4, 7 да прыпынку "Парк Горкага", аўтобусамі 57, 77 да прыпынку "Першамайская").

Жыхары іншых абласцей, якія жадаюць удзельнічаць у кампаніі, накіроўваюць заяўкі ў свае абласныя цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Неразборліва і неахайна запоўненыя рэгістрацыйныя карткі прымацца не будуць.

Стартавы дзень адмовы ад курэння — 2 мая 2004 г. У кампаніі ўдзельнічаюць толькі зарэгістраваныя ўдзельнікі, якія цалкам адмовіліся ад курэння не менш чым на 4 тыдні (з 2 па 29 мая). 26 мая ў 14.00 у Мінскім гарадскім цэнтры здароўя будзе разыгрывацца латарэя сярод удзельнікаў кампаніі. Пераможцы, якія пацвердзяць вынікі некурэння, атрымаюць прызы і будуць прадстаўлены на розыгрыш галоўнага і заахвочвальных прызоў рэспубліканскага ўзроўню. Тамсама будуць разыгрывацца пуцёўкі на ўдзел у розыгрышы шасці еўрапейскіх прызоў (па 2500$) і аднаго міжнароднага суперпрыза (10.000$). Для пацвярджэння факта некурэння прэтэндэнтаў на галоўныя прызы будзе выкарыстаны тэст на вызначэнне вокісу вугляроду ў паветры, якое выдыхае прэтэндэнт, ці іншы біялагічны тэст.

Па даведкі звяртайцеся па тэл. 227-54-14, 227-45-17, 227-06-08.

*Аргкамітэт*

**Quit and win — 2004**
**Кінь курыць і выйграй — 2004**

Рэгістрацыйная картка ўдзельніка

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Дата нараджэння дзень ☐☐ месяц ☐☐ год ☐☐
Пол ☐ мужчынскі ☐ жаночы
Прафесія ____________________
Адрас: ____________________

Тэлефон: працоўны ____________
хатні ____________

Колькасць выкураных за дзень ☐☐
(цыгарэтаў + папяросаў + сігараў)
Раней спрабавалі (ла) кінуць курыць
☐ ні разу ☐ 1—2 разы ☐ 3 разы і больш
Куру на працягу ☐☐ гадоў

Я пацвярджаю, што буду ўдзельнічаць у конкурсе ў адпаведнасці з міжнароднымі правіламі.

Подпіс ____________ Дата ____________

Сведка майго ўдзелу ў кампаніі:
Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________
Адрас: ____________________
Тэлефон: працоўны ____________
хатні ____________

Пацвярджаю факт папярэдняга курэння ўдзельніка кампаніі і адмовы ад яго на працягу 4 тыдняў з 2 мая па 29 мая 2004 года.

Подпіс ____________ Дата ____________

МАЙСТРОЎНЯ

## Поэзия

О созвучие слов,
Ты — прекрасно,
Как основа у снов
Не напрасно.

Не пустой перезвон
Чьих-то связок,
А души камертон,
Время сказок.

Растворяешь в себе
Ты любого,
Кто доверит тебе
Ритм и слово.

## Конверт

Уют. Камин.
Огонь. Молчанье.
Глаза. Один.
Воспоминанье.

Ночь. Грусть. Тепло.
Ладони. Блики.
Конверт. Письмо.
Упрёки. Крики.

Письмо. Конверт.
Она. Прощанье.
Огонь. Ответ.
Огонь. Молчанье.

## Виньетка

*Пусть расцветают все цветы*
*(китайская пословица)*

Пусть расцветают все цветы,
А позже ясно станет,
Где искра божьей красоты,
А где - само увянет.

## Домолилась

О странный Бог, треклятый Бог,
На что же ты меня обрёк?!
Просила я о вдохновеньи —
Взамен увидела порок.

## Жилец его глаз

В его глазах таился демон,
Мой демон, худшее из зол;
И, как сюжет проводит тему,
Меня он за собою вёл.

## Китайский сувенир

Первый раз я увидел на веере,
Где-то в лавке его купив,
Расцветающий дивной
феерией
На прозрачной китайской
материи
Поднебесной страны мотив;

И в загадочных иероглифах
Мне почудился твой портрет.
Ясновиденье каллиграфа?
Из нежнейшего шёлка шороха,
Мне тогда прозвучал ответ...

*Нурида Муслимова*
*студентка факультета довузовского образования*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

22 красавіка 2004 г.
Падпісана да друку 22.04.2004 г.
Ум. друк. арк. 1
Зак. 376. Тыраж 1000 экз.
Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк

Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Т.М. КАЗАК

Адрас рэдакцыі:
220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by